11. Щуркова, Н.Е. Прикладная педагогика воспитания: учеб. пособие / Н.Е. Щуркова. – СПб.: Питер, 2005. – 366 с.
12. Притчи, сказки, метафоры в развитии ребенка. – СПб.: Речь, 2007. – 296 с.
13. Колошина, Т.Ю. Арт-терапевтические техники в тренинге: характеристики и использование: практ. пособие для тренера / Т.Ю. Колошина, А.А. Трусь. – СПб.: Речь, 2010. – 189 с.
14. Алексеев, К.И. Метафора как объект исследования в философии и психологии / К.И. Алексеев // Вопросы психологии. – 1996. – № 2. – С. 73–85.
15. Зинкевич-Евстигнеева, Т.Д. Основы сказкотерапии / Т.Д. Зинкевич-Евстигнеева. – СПб.: Речь, 2007. – С. 163–166.

*Поступила 12.05.2010*

# МАГЧЫМАСЦІ РАЗВІЦЦЯ ПРЫРОДНАГА ТУРЫЗМУ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ НА АСНОВЕ ФАРМАЛЬНЫХ ПРЫКМЕТАЎ РАЯНАВАННЯ

***А.С. Шаблыка,***
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры

*У гэтым артыкуле прапанаваныя шляхі вырашэння праблемы развіцця ўнутранага турызму ў Рэспубліцы Беларусь праз спецыялізацыю краіны на выключным выглядзе турызму, што здольны забяспечыць істотны эканамічны прыбытак пры малых інвестыцыях; дадзена кароткая характарыстыка сучаснага стану турызму ў краіне і абгрунтаванне прыроднага турызму як выключнага для Рэспублікі Беларусь; апісваецца спосаб рацыянальнага і аптымальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў Рэспублікі Беларусь у турысцкіх мэтах, які заключаецца ў адмысловым занаванні тэрыторыі краіны і вылучэнні ў атрыманых зонах найбольш перспектыўных раёнаў развіцця прыроднага турызму.*

*The ways of domestic tourism development in the Republic of Belarus by means of the country's exceptional specialization in tourism which is capable to ensure significant economic profit on the basis of small investments are proposed in the article; a brief characteristic of the modern state of tourism in the country and substantiation of nature tourism as peculiar for the Republic of Belarus is given; a way of rational and optimal implementation of nature resources of the Republic of Belarus for tourist purposes consisting in a specialized zoning of the country's territory and choosing of the most profitable regions for natural tourism development is described.*

Рэспубліка Беларусь не належыць да катэгорыі дзяржаў, што атрымліваюць у нацыянальным і тым больш міжнародным маштабах істотны прыбытак ад турызму. Але ў цяперашні час і на дзяржаўным, і на прыватным узроўні прымаюцца захады да вырашэння праблемаў развіцця ўнутранага турызму і прываблівання замежных турыстаў у краіну, а таксама да заахвочвання айчынных грамадзян адпачываць на Беларусі. Каб тое сталася рэчаісным у цяперашніх беларускіх і сусветных эканамічных

умовах, найбольш мэтазгоднай падаецца вузкая турысцкая спецыялізацыя краіны і засяроджанне на такім тыпе турызму, які з'яўляецца адначасова перспектыўным і ажыццяўляльным з эканамічнага і арганізацыйнага гледзішча.

Улічваючы трансфармацыйны стан экономікі Рэспублікі Беларусь, бясспрэчна тое, што краіна не здолее выйсці на сусветны турысцкі ўзровень і атрымліваць значны прыбытак ад турызму пры выкарыстанні ў сучасных умовах найбольш пашыранай мадэлі развіцця, а менавіта – засяроджанне на самых масавых і прыбытковых тыпах турызму і задавальненне стандартных турысцкіх патрабаванняў, дзе найважнейшую ролю грае адпаведнасць прапанаванага прадукту сусветным стандартам.

Рэспубліка Беларусь у сучасных эканамічных умовах здолее дасягнуць значных поспехаў у турызме толькі прапаноўваючы тое, чаго няма больш нідзе ў свеце, аб'ектаў настолькі выключных на погляд спажыўцоў турысцкіх паслугаў, што жаданне іх наведаць будзе прыглушаць патрэбу ва ўзорнай інфраструктуры і выдатным абслугоўванні.

Выключнасць турысцкай паслугі галоўным чынам вызначаецца наступнай акалічнасцю. Усё больш людзей звяртаюцца па турысцкіх паслуг з мэтаю не столькі проста адпачыць, колькі атрымаць пэўныя ўражанні ад адпачынку. Гэтыя ўражанні могуць істотна адрозніваацца, але ўсе яны накіраваны на задавальненне патрабаванняў турыста, а стваральнікі турысцкіх паслуг павінны вызначыць і распрацаваць такі турысцкі прадукт, які найлепшым чынам можа іх задаволіць. Таму да патэнцыйных наведвальнікаў мусіць даводзіцца не проста выключнасць прапанаванага тура, а выключнасць атрыманых ад яго ўражанняў. І толькі пасля ўсведамлення таго, што выкарыстанне паслугі здольнае задаволіць патрэбу ва ўражаннях, турыст будзе гатовы і зацікаўлены набыць прапанаваны прадукт.

У сувязі з гэтым паўстаюць праблемы стварэння асаблівай паслугі, давядзення яе ўнікальнасці да пакупнікоў. Вырашэннем гэтага пытання з'яўляецца належным чынам распрацаваны і ўвасоблены комплекс маркетынгу, які здольны забяспечыць аптымальнае выкарыстанне прывабнасці аб'екта для прыцягнення турыстаў, а таксама – адпаведная сегментацыя турысцкага рынка і выбар мэтавага сегмента для прапановы туру.

Вядучую ролю ў камерцыйнай рэалізацыі выключных турысцкіх паслуг грае іхе выхад на мэтавы сегмент рынку, закліканы стварыць аптымальныя ўмовы іх рэалізацыі на розных этапах жыццёвага цыклу, што ўвасабляецца ў камунікацыйнай палітыцы прадпрыемства, мэты якой заключаюцца ў забеспячэнні інфармаванасці мэтавай аўдыторыі, стварэнні станоўчага стаўлення да паслугі і схіленні да яе спажывання [1].

Вызначэнне мэтавай аўдыторыі выключных турысцкіх паслуг грунтуецца на спецыфіцы запатрабаванняў спажыўцоў. У турызме яны відавочныя: попыт надзвычай пластычны да ўзроўню даходаў і цэн, а таксама шмат у чым залежыць ад патрабаванняў. Яны падзяляюцца на эканамічныя (патрэба ў эканоміі сродкаў, часу і намаганняў пры атрыманні пэўнага ўзроўню камфорту), сацыяльнага статута (прэстыжнасць атрыманых паслуг) і мэтавыя (ажыццяўленне ўсталяваных

мэтаў адпачынку) [2]. Паводле іх вызначаецца тып і характарыстыкі турызму, а фінансавыя магчымасці абумоўліваюць якасць абслугоўвання кліентаў [3]. На падставе апісаных фактараў адбываецца сегментацыя турысцкага рынку спажыўцоў.

Правільна вызначыўшы рынкавы сегмент і належным чынам прапанаваўшы тур, небеспадстаўна можна разлічваць на істотны прыбытак ад яго рэалізацыі.

Дзеля вызначэння выключнага для Рэспублікі Беларусь тыпу турызму неабходна даць належную характарыстыку ўсёй разнастайнасці гэтых тыпаў. Паводле мэтаў наведвання вылучаюцца наступныя тыпы: рэкрэацыйны, лекава-аздараўленчы, пазнавальны, дзелавы, спартыўны, этнічны, рэлігійны, транзітны, адукацыйны [4].

Адсутнасць у Беларусі гор і выхаду да мора адмаўляе існаванне самых масавых і прыбытковых формаў рэкрэацыйнага турызму: гарналыжнага і пляжнага. Але будзе памылкова аспрэчваць высокі рэкрэацыйны патэнцыял Рэспублікі Беларусь, таму што прыродныя рэсурсы краіны маюць усе перадумовы да ўстойлівага і эфектыўнага выкарыстання іх ў турысцкіх мэтах не толькі ў рэкрэацыі, але і ў любой іншай вобласці, звязанай з прыродным асяродкам.

Лекава-аздараўленчая інфраструктура краіны з’яўляецца дастаткова развітай [5], і напаўняльнасць санаторыяў апошнім часам знаходзіцца на ўзроўні 90 % пры долі замежных турыстаў у 13–15 %, але ў той жа час 82 % наведвальнікаў айчынных санаторыяў у 2008 годзе адпачывалі за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту і фонду сацыяльнага страхавання [6]. Таму далейшае развіццё санаторнага турызму ў Рэспубліцы Беларусь немагчыма пры адсутнасці патэнцыялу. Павелічэнне даходу ад лекава-аздараўленчых паслуг можа адбывацца праз памяншэнне колькасці сацыяльных пуцёвак, што не адпавядае сучаснай дзяржаўнай палітыцы, або праз стварэнне новых санаторных месцаў, што нерэальна ў кароткатэрміновым перыядзе.

Непрыдатная заканадаўчая база, адсутнасць зацікаўленасці ўладаў на ўсіх узроўнях у ахове гісторыка-культурных архітэктурных помнікаў, поўная занядбанасць большасці з іх і сціплы музейны фонд краіны зводзяць на нішто нават самыя перспектыўныя праекты развіцця пазнавальнага турызму.

Малая верагоднасць развіцця дзелавога турызму ў Рэспубліцы Беларусь відавочная. Па-першае, на захадзе і паўночным захадзе Беларусь мяжуе з краінамі, дзе інфраструктура для гэтых мэтаў лепшая. Па-другое, наяўнасць візавага рэжыму амаль для ўсіх еўрапейскіх краін пры яго адсутнасці для грамадзянаў краінаў Шэнгенскага пагаднення ў вышэйзгаданых суседзяў, дае апошнім бясспрэчныя перавагі. Па-трэцяе, непрыкметная роля беларускага капіталу ў сусветным бізнесе не здольная звярнуць ўвагу шырокіх эканамічных колаў да краіны.

Інтарэс, з якім ставяцца ў Беларусі да спорту, хоць і мае вялізнае значэнне для прапаганды здаровага ладу жыцця і паляпшэння здароўя нацыі, але з’яўляецца недастатковым для прываблівання спартыўных турыстаў у сур’ёзных аб’ёмах. У краіне ўвогуле не праводзіцца міжнародных чэмпіянатаў па масавых ці прэстыжных відах спорту, якія б матывавалі спартыўную супольнасць да наведвання краіны.

Колькасць беларусаў, якія ў цяперашні час сталі знаходзіцца па-за межамі Радзімы, ацэньваецца ў 2–2,5 млн чалавек [7], што складае каля 20 % усёй беларускай нацыі. Вялікая колькасць этнічных турыстаў, якія маюць усе падставы да прыезду ў Рэспубліку Беларусь, безумоўна, сведчыць на карысць пэўнай перспектыўнасці адпаведнага тыпу турызму для краіны. Але паколькі прытоку этнічных турыстаў не назіраецца, то застаецца зазначаць, што прычыны складаенай сітуацыі не ляжаць на паверхні, і на іх высвятленне і выпраўленне патрабуецца шмат часу і намаганняў.

Што да рэлігійёзнага турызму, то ў Рэспубліцы Беларусь у цяперашні час існуюць толькі тры больш-менш буйныя цэнтры паломніцтва: штогадовы фэст Маці Божай ў мястэчку Будслаў на пачатку ліпеня, у якім удзельнічае да 50 тысячаў паломнікаў [8]; крыж Св. Ефрасінні ў Полацку і Святы крыж у Тураве, якія карыстаюцца меншай вядомасцю. Натуральна, што гэтага далёка не дастаткова для адчувальнага ўкладу ад абслугоўвання вернікаў у дзяржаўны скарб, хаця колькасць рэлігійных турыстаў і застаецца стабільнай з году ў год.

Транзітны турызм паводле свайго вызначэння не можа з’яўляцца галоўнай перспектывай развіцця турысцкай галіны любой краіны. Турысты трацяць звычайна куды большыя грошы ў месцы прыбыцця, чым на шлях да яго. Таму варта імкнуцца не да павелічэння аб’ёму транзіту турыстаў праз тэрыторыю краіны, а стымуляваць выбар турыстамі Рэспублікі Беларусь у якасці месца прызначэння, а таксама ўдасканальваць адпаведную інфраструктуру разам з належным узроўнем паслуг.

50 вышэйшых навучальных установаў Рэспублікі Беларусь ажыццяўляюць падрыхтоўку студэнтаў з ліку замежных грамадзянаў. Экспарт адукацыйных паслуг складае толькі каля 0,3 % ад агульнага экспарту краіны [9], але пры гэтым нельга забывацца, што ў дадатак да платы за адукацыю замежныя студэнты выдаткоўваюць сродкі на пражыванне і іншыя патрэбы, якія таксама павялічваюць дзяржаўны скарб Рэспублікі Беларусь. Кепскія перспектывы адукацыйнага турызму тлумачацца тым, што беларускія дыпломы аб вышэйшай адукацыі прызнаюцца толькі ў чатырох краінах: Кітаі, В’етнаме, Расіі і Польшчы. Істотныя пазітыўныя зрухі ў гэтай вобласці могуць адбыцца толькі пасля падпісання двухбаковых дамоў аб прызнанні дыпломаў з іншымі дзяржавамі, што магчыма толькі пры далучэнні Рэспублікі Беларусь да Балонскага працэсу.

З прыведзенаq характарыстыкі зразумела, што ўсе вышэйзгаданыя тыпы турызму з розных нагодаў з’яўляюцца малаперспектыўнымі для Рэспублікі Беларусь. Але ў дачыненні да прыроднага турызму назіраецца зусім іншая сітуацыя. Адзіным турысцкім рэсурсам, які ў дадзены момант знаходзіцца на Беларусі ў прыдатным да выкарыстання стане, з’яўляецца прыродны асяродак. У краіне шмат мясцін, што зведалі ўмераны антрапагенны ўплыў, захавалі сваё спрадвечнае аблічча ў нязначна змененым выглядзе, а іх унікальнасць засведчаная не толькі ў еўрапейскім, але і ў сусветным маштабе [10, 11]. Пра гэта ўскосна сведчыць і развіццё агратурызму на Беларусі [12], што ніяк не здольны развівацца па-за прыродным асяродкам.

Прыродныя і сацыяльна-палітычныя ўмовы Рэспублікі Беларусь спрыяюць захаванню на яе тэрыторыі шэрагу рэдкіх у нацыянальным і міжнародным маштабе экасістэм, а таксама каштоўных відаў жывёл і раслін. У краіне і цяпер захаваліся працяглыя абшары натуральных краявідаў. Сярод іх асаблівае значэнне ва ўстойлівасці аўтэнтычнай флоры і фаўны маюць поймы рэк і забалочаныя тэрыторыі. А ў выніку апошніх даследаванняў сталі відавочнымі ўнікальнасць і выключнае значэнне тэрыторыі Рэспублікі Беларусь для захавання глабальнай біялагічнай разнастайнасці [10].

Іменна прыродны турызм атрымліваецца выключным для Рэспублікі Беларусь. Беларускія аб’екты прыроднага турызму з’яўляюцца прывабнымі на планетарным узроўні, здольныя паўсюдна выклікаць сапраўдны інтарэс і матываваць турыстаў да наведвання.

Такім чынам, адзіным выключным і сапраўды перспектыўным тыпам турызму для Рэспублікі Беларусь з’яўляецца прыродны. Рацыянальнае выкарыстанне і выхад на міжнародны ўзровень яго аб’ектаў здольныя ўжо ў кароткачасовай перспектыве прыносіць значную эканамічную карысць і спрыяць павышэнню дабрабыту краіны. Доказам апошняй пастановы з’яўляецца глабальная статыстыка: ў 2004 годзе эканамічны рост прыроднага турызму ў тры разы перавышаў агульны рост турысцкай індустрыі і складаў на міжнародным рынку 10–12 % у год [13].

Так як Рэспубліка Беларусь валодае дастатковымі рэсурсамі для паспяховага развіцця прыроднага турызму, то актуальным з’яўляецца пытанне іх рацыянальнага выкарыстання, якое магчыма ажыццявіць праз адмысловае раянаванне і занаванне тэрыторыі краіны ў мэтах прыроднага турызму. Мэтазгоднасць такога падыходу грунтуецца на наступных фактарах:

1. Аптымізацыя функцыяў кіравання.
2. Распрацоўка індывідуяльнага падыходу да кожнага раёну з улікам уласцівых яму асаблівасцяў, патрэбаў і праблемаў.
3. Вызначэнне найбольш перспектыўных мясцін у межах раёнаў.
4. Стварэнне эфектыўнай сеткі турысцкіх маршрутаў і ўстаноў абслугоўвання турыстаў у кожным раёне.
5. Выкарыстанне дадзеных, атрыманых падчас правядзення раянавання, пры прадстаўленні адпаведных турысцкіх прадуктаў.
6. Паглыбленне экалагічных і эканамічных ведаў мясцовага насельніцтва ў праекцыі на раён прыроднага турызму, у якім яны пражываюць, што садзейнічае далучэнню насельніцтва да прыродаахоўнай і прадпрымальніцкай дзейнасці.
7. Узаемавыгаднае памежнае і міжраённае супрацоўніцтва.
8. Рацыянальнае і ўстойлівае выкарыстанне прыродна-культурнага патэнцыялу краіны у турысцкіх мэтах.

Мэтаю раянавання з’яўляецца вызначэнне найлепшых раёнаў для развіцця прыроднага турызму ў Рэспубліцы Беларусь, што ажыццяўлялася ў два паслядоўныя этапы:

1) падзел тэрыторыі краіны на зоны ў мэтах прыроднага турызму;
2) вылучэнне ў атрыманых зонах найбольш перспектыўных раёнаў для развіцця прыроднага турызму.

За аснову занавання былі ўзятыя наступныя крытэрыі:

– гісторыка-культурны (межы дзяржаўных утварэнняў, арэалы плямёнаў, распаўсюджанасць культурных асаблівасцяў);

– прыродны (агульнапрынятыя прыродныя зоны, арэалы раслін і жывёл);

– ландшафтны (характар рэльефу, тыпы лясоў, забалочанасць, рачная сетка, азёрныя гурты);

– экалагічны (ступень прамысловай і радыяцыйнай забруджанасці, асабліва ахоўныя прыродныя тэрыторыі);

– адміністрацыйны (межы краіны, абласцей, раёнаў і асабліва ахоўных прыродных тэрыторыяў);

– інфраструктурны (сродкі камунікацыі і размяшчэння);

– транспартны (магчымасць зручнага перамяшчэння ў межах зоны на нематарызаваным транспарце).

У выніку праведзенага занавання тэрыторыі Рэспублікі Беларусь паводле вышэйпералічаных крытэрыя было атрымана 6 зон: «Літва», «Паазер’е», «Задзвінне», «Прыдняпроўе», «Случчына» і «Палессе». Сталіца Беларусі і ваколіцы, вылучаныя ў асобны рэгіён, які праз малую наяўнасць прыродных рэсурсаў і высокую тэхнагенную забруджанасць, пры занаванні ў мэтах прыроднага турызму не разглядаліся. Таксама па-за ўвагай пакінуты радыяцыйна забруджаныя тэрыторыі краіны, паколькі ажыццяўленне турызму на іх небяспечна для здароўя не толькі наведвальнікаў, але і абслугоўваючага персаналу. Увасабленне занавання прыведзена на малюнку 1.




Малюнак 1 – Зоны прыроднага турызму Рэспублікі Беларусь

За крытэрыі раянавання былі ўзяты наступныя:

– ступень забруджанасці (наяўнасць на тэрыторыі раёна ці блізкасць да буйных прамысловых цэнтраў і транспартных магістраляў, урон ад наступстваў на аварыі Чарнобыльскае АЭС);

– біягеаграфічная разнастайнасць (краявіднае, жывёльнае і расліннае багацце);

– шчыльнасць насельніцтва (наяўнасць маланаселеных тэрыторыяў без крытычнага антрапагеннага ўплыву);

– ступень аховы (колькасць запаведнікаў і нацыянальных паркаў, колькасць асабліва ахоўнай прыроднай тэрыторыі рэспубліканскага значэння);

– агульны пляц (магчымасці арганізацыі працяглых і насычаных падарожжаў);

– наяўная турысцкая інфраструктура (ужо створаныя сродкі абслугоўвання турыстаў і іх якасць);

– славутасці (аб’екты непрыроднага турызму, што могуць выклікаць дадатковую цікавасць да раёна).

Вынікам раянавання тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у мэтах прыроднага турызму стала вылучэнне 11 раёнаў, дзе існуюць найлепшыя перспектывы развіцця гэтага тыпу турызму: «Астравы Дулебы», «Белавежская пушча», «Верхняя Бярэзіна», «Вушацкія азёры», «Дзісна–Дзвіна», «Задзвінне», «Маларыта», «Налібоцкая пушча», «Паўночна-Заходняе Палессе», «Пціч» і «Сярэдняе Палессе». Размяшчэнне гэтых раёнаў паказанае на малюнку 2.




Малюнак 2 – Раёны Рэспублікі Беларусь з найлепшымі перспектывамі развіцця прыроднага турызму

1. Акулич, И.Л. Маркетинг: учебник / И.Л. Акулич. – Минск: Вышэйшая школа, 2009. – 511 с.

2. Демченко, Е.В. Маркетинг услуг: учеб. пособие / Е.В. Демченко. – Минск: БГЭУ, 2002. – 161 с.

3. Биржаков, М.Б. Введение в туризм: учебник / М.Б. Биржаков. – СПб.: Герда, 2006. – 512 с.

4. Бабкин, А.В. Специальные виды туризма / А.В. Бабкин. – Ростов н/Д: Феникс, 2008. – 252 с.

5. Інтэрнэт-партал аб санаторыях Беларусі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://sanatorii.by/?setlng=by&id=main. – Дата доступа: 15.02.2010.

6. Литвинова, В. Путевки в белорусские санатории давно распроданы / В. Литвинова // Белорусские новости [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://naviny.by/rubrics/tourism/2009/05/27/ic_articles_126_162832. – Дата доступа: 27.05.2009.

7. Гардзіенка, Н. Беларуская дыяспара як аб'ект гістарычнага дасьледаваньня / Н. Гардзіенка // Беларускі Калегіюм [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://baj.by/belkalehium/lekcyji/historyja/hardzijenka-n_01.htm. – Дата доступа: 17.02.2010.

8. Фэст Маці Божай Будслаўскай // Наша ніва [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://news.tut.by/otklik/112240.html. – Дата доступа: 03.07.2008.

9. Иностранные студенты вузов Беларуси // Информационно-аналитический ресурс о системе высшего образования [Электроннный ресурс]. – Режим доступа: http://www.edubelarus.info/index.php?newsid=100. – Дата доступа: 15.02.2010.

10. Казулін, А.В. Скарбы прыроды Беларусі / А.В. Казулін. – Мінск: Беларусь, 2005. – 215 с.

11. Блакітны скарб Беларусі: энцыклапедыя. – Мінск: БелЭн, 2007. – 480 с.

12. Шелегович, О. Около 36 000 туристов в Беларуси местом отдыха выбрали агроэкоусадьбы / О. Шелегович // БЕЛТА [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://news.tut.by/129207.html. – Дата доступа: 13.02.2009.

13. Global Ecotourism Fact Sheet // The International Ecotourism Society. – Washington, 2006. – 6 p.

14. Александрова, А.Ю. Международный туризм: учебник / А.Ю. Александрова. – М.: Аспект Пресс, 2002. – 470 с.

*Поступила 26.05.2010*

## СОЦИАЛЬНО-ЭКОНОМИЧЕСКИЕ АСПЕКТЫ РАЗВИТИЯ ЭКОЛОГИЧЕСКОГО ТУРИЗМА

***Л.В. Штефан, канд. геол.-минерал. наук, доцент,***
Белорусский государственный университет физической культуры

*При развитии экологического туризма могут возникать как позитивные, так и негативные социально-экономические эффекты, которые необходимо учитывать при планировании и управлении туристической деятельностью на местах. Туризм может положительно сказаться на развитии сельского региона, только если он «интегрирован», связан с другими аспектами сельской жизни. Если такой связи нет, экологический туризм может вместо пользы нанести ущерб и местности, и людям.*